12. Отделение частицы св. мощей преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой для Холмской епархии // Полоц. епарх. ведомости. – 1912. – № 20. – С. 394.
13. Петровский, П. Праздник преп. Евфросинии, 23 мая, в г. Полоцке / П. Петровский // Полоц. епарх. ведомости. – 1894. – № 13. – С. 575–577.
14. Полоцкий Спасо-Евфросиниевский монастырь (около 1128–1944) // Полоц. епарх. ведомости. – 1999. – № 7. – С. 1–2.
15. Празднование дня памяти Преподобной Евфросинии, Княжны Полоцкой, в г. Полоцке // Полоц. епарх. ведомости. – 1893. – № 12. – С. 521–526.
16. Птицын, В. Гробница преподобной княжны Полоцкой Евфросинии в Киево-Печерской лавре / В. Птицын // Полоц. епарх. ведомости. – 1909. – № 42. – С. 817–818.
17. Сабинин, Е. Празднование памяти Преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, в г. Ростове-Ярославском 23 мая 1916 г. / Е. Сабинин // Полоц. епарх. ведомости. – 1916. – № 25. – С. 344–347.
18. Торжество перенесения частицы св. мощей преподобной Евфросинии, Княжны Полоцкой, из г. Полоцка в Витебский кафедральный собор // Полоц. епарх. ведомости. – 1912. – № 17. – С. 311–313.
19. Уделение частиц св. мощей преп. Евфросинии княжны Полоцкой // Полоц. епарх. ведомости – 1911. – № 46. – С. 1056.
20. Х., С. Попытки к перенесению мощей преподобной Евфросинии княжны Полоцкой (церковно-ист. справка) / С. Х. // Полоц. епарх. ведом. – 1909. – № 15. – С. 237–239; № 16. – С. 259–261; № 17. – С. 278–283; № 18. – С. 284–293; № 19 – С. 309–314.
21. Чикильдин, Б. Мои впечатления при перенесении мощей Преподобной Евфросинии в г. Полоцке / Б. Чикильдин // Полоц. епарх. ведомости. – 1998. – № 7. – С. 3.

**Рымко В.Г.**

## ЛІТОЎСКІЯ І ГРОДЗЕНСКІЯ ЕПАРХІЯЛЬНЫЯ ВЕДАМАСЦІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ЗАМОЙСКАГА САБОРА 1720 г.

Праваслаўныя даследчыкі другой паловы XIX – пачатку XX ст., якія займаліся гісторыяй грэка-каталіцкай царквы, шмат увагі надавалі Брэсцкаму царкоўнаму сабору 1596 г., вынікам якога стала ўзнікненне ўніяцтва на беларускіх землях. Аднак шмат матэрыялаў было прысвечана вывучэнню іншых ўніяцкіх царкоўных сабораў і асабліва Замойскага сабору 1720 г., які стаў лёсавызначальным у гісторыі грэка-каталіцтва. Часта такія даследаванні выходзілі не асобным выданнем, а друкаваліся на старонках афіцыйнага праваслаўнага выдання – «Епархиальные ведомости» – якое дзейнічала ў межах кожнай праваслаўнай епархіі Расійскай імперыі. У прыватнасці працы, прысвечаныя гісторыі Замойскага сабора, былі надрукаваныя на старонках Літоўскіх (1863–1916) і Гродзенскіх (1901–1915) епархіяльных ведамасцей.

У «Литовских епархиальных ведомостях» за 1888 г. была змешчана праца І. Стральбіцкага [3], заснаваная на шырокім дакументальным і гістарыяграфічным матэрыяле. Па меркаванні аўтара, які вывучыў усе ўніяцкія саборы пасля 1596 г., асноўным для далейшага развіцця ўніяцтва стаў Замойскі сабор. Насуперак распаўсюджанаму меркаванню іншых праваслаўных гісторыкаў аб тым, што ўніяцкія мітрапаліты намагаліся супрацьстаяць лацінізацыі ўніі, І. Стральбіцкі ўсю заслугу барацьбы за чысціню ўніяцкай абраднасці і дагматыкі прыпісаў выключна беламу грэка-каталіцкаму святарству, якое «одно силилось еще оказать сопротивление гигантской силе латинизаторских стремлений и базилиан» [3, с. 215–216].

Гісторыя Замойскага сабора была прадстаўлена таксама на старонках «Гродненских епархиальных ведомостей» у працы С.К. Паўловіча [2], які называў яго «центральным пунктом истории западно-русской униатской церковной унии» [2, с. 284]. У нарысе паказаны стан уніяцкай царквы ў XVII ст., прааналізаваны прычыны і ўмовы, якія выклікалі Замойскі сабор, вывучаны змест і характар яго пастаноў, значэнне сабора і яго наступствы. У якасці палітычных і рэлігійных прычын, якія справакавалі ў свой час з'яўленне ўніяцтва, С.К. Паўловіч называў узмацненне пасля 1569 г. каталіцкай прапаганды ў дзяржаве на чале з ордэнам езуітаў; жаданне папскага прастола распаўсюдзіць свой уплыў не толькі на беларускія і ўкраінскія землі, але і ў Маскоўскай дзяржаве; крызіс праваслаўнай царквы ў XVI ст. [2, с. 287]. Калі напачатку свайго існавання ўніяцкая царква захоўвала праваслаўную абраднасць і дагматыку, была адносна незалежнай ад папы, які толькі зацвярджаў кандыдатуру мітрапаліта, то ў далейшым можна было бачыць, як каталіцкія парадкі закрадаліся ў розныя сферы яе жыцця. Асаблівая ўвага ў сувязі з гэтым надавалася ролі базіліянскага ордэна ў лацінізацыі ўніі, які, «скроенный по образцу католических монашеских орденов, являлся вполне латинским учреждением, глубоко пропитался латинским духом и проникся уважением и преданностью Риму» [2, с. 302]. Да XVIII ст., як пазначаў аўтар, уніяцкая царква ўвайшла ў стан крызісу. Рым і вышэйшая каталіцкая іерархія Рэчы Паспалітай лічылі яе поўнасцю адслужыўшай сваю службу па адцягненню насельніцтва беларускіх і ўкраінскіх земляў ад праваслаўя і ўжо гатовай да поўнага зліцця з каталіцтвам. На пачатку XVIII ст. адзначаліся бяскарныя наезды каталіцкай шляхты на ўніяцкія храмы і мана-



Рэпазіторый ВДУ

стыры, прыгнёт уніцкага святарства, адчужэнне царкоўнай і манастырскай маёмасці, адным словам, унія стала веравызнаннем «низшаго разбора, не более как «хлопской» верой» [2, с. 330]. Усё больш частымі да гэтага часу сталі пераходы ўніятаў у каталіцтва, узрасла роля папы ў кіраванні ўніяцкай царквой, а значэнне мітрапалітаў і епіскапаў адпаведна скарацілася.

Уніяты не маглі не заўважаць крызіса ў сваёй царкве, у сувязі з чым утварылася «особая партия православно-униатская из белаго духовенства, немногих высших ун. иерархов и некоторых из базилиан» [2, с. 352], якая імкнулася адстаяць незалежнасць уніяцкай царквы. Аўтар не пагаджаўся з меркаваннем М. Каяловіча, што барацьба мітрпапаліта Л. Кішкі і базіліянскага ордэна была «семейной, домашней враждой», імкненнем мітрапалітаў «удержать за собой протоархимандритство, а со стороны епископов – овладеть богатыми монастырями» [2, с. 353]. Наадварот, С. Паўловіч бачыў у гэтай барацьбе імкненнне іерархаў адстаяць самастойнасць сваёй царквы. Побач з дзейнасцю так званай уніяцка-праваслаўнай партыі, аўтар вылучыў наяўнасць варожай ёй каталіцкай партыі. Менавіта гэтыя дзве партыі ініцыявалі Замойскі сабор.

Акрамя таго, існавала яшчэ шмат іншых аб’ектыўных прычын для склікання сабора: зняважлівы стан белага святарства, прыўнёсак ва ўніяцтва мноства каталіцкіх элементаў, узмацненне ордэна базіліян. Таксама «уния на своей стороне не имела ни предания, ни ясно очерченнаго самостоятельнаго учения, а потому естественно приводила к смешению в догматах и обрядах и позволяла каждому в делах веры поступать так, как ему вздумается» [2, с. 379].

Галоўным натхняльнікам і арганізатарам сабора з’яўляўся ўніяцкі мітрапаліт Леў Кішка. Па словах аўтара, ён быў «типичнейшим выразителем того разлада и раздвоения, какое лежит в самом существе унии» [2, с. 386], маючы на ўвазе, што калі Л. Кішка быў протаархімандрытам базіліянскага ордэна, то абараняў базіліянскую палітыку, а як толькі стаў мітрапалітам, то пераўтварыўся ў непрымірымага ворага уніяцкага манаства.

Цікавымі з’яўляюцца здагадкі аўтара адносна пераносу даты сабора з 1716 г. на 1720 г. У якасці прычын ім пазначаны ўваход у межы Рэчы Паспалітай саксонскіх войскаў і канфедэрацыя 1716 г. Акрамя таго, першапачаткова сабор планавалася правесці ў Львове, дзе праваслаўныя традыцыі былі адносна моцнымі, дзейнічала Львоўскае праваслаўнае брацтва, унія толькі нядаўна была ўведзена і не паспела пусціць каранёў так глыбока, як у іншых рэгіёнах краіны. Аднак каталікі і базіліяне хутка ацанілі гэтую сітуацыю і, спасылаючыся на «моровое поветрие», перанеслі сабор на тэрыторыю Польшчы, у Замосце, дзе іх падтрымлівалі польскія войскі і каталіцкае асяроддзе.

С. Паўловіч разгледзіў прывітальную прамову папскага нунцыя і намесніка сабора І. Грымальдзі, адзначыўшы, што яна ўяўляла сабой «образец чисто иезуитского творчества и была проникнута духом обличения униатской иерархии и порядков униатской церкви» [2, с. 399]. Уніяцкія іерархі, якія прысутнічалі на саборы, апроч свайго жадання вымушаны былі пагадзіцца з пастановамі сабора, так як не жадалі парываць добрых адносін з Рымам. Усе планы мітрапаліта Л. Кішкі і яго партыі праваліліся, а менавіта стварэнне другой базіліянскай кангрэгацыі, падпарадкаванай мітрапаліту, і заснаванне семінарыі для белага ўніяцкага святарства. Адзіным станоўчым момантам стала рашэнне сабора ўніфікаваць правілы і нормы, а таксама заканадаўства ва ўніяцкай царкве. Падрабязна прааналізаваны ў рабоце пастановы Замойскага сабора, якія аўтар класіфікаваў па 4 накірунках: 1) дагматычныя, 2) царкоўна-абрадавыя, 3) царкоўна-адміністратыўныя, 4) дысцыпалінарна-практычныя [2, с. 423]. З гэтых матэрыялаў бачна, наколькі была алацінена ўніяцкая царква яшчэ да сабора, які не толькі дадаў новыя каталіцкія традыцыі ва ўніяцкую царкву, але і замацаваў шматлікія з тых, якія ўжо існавалі ў ёй. Адзінае, чаго не дамагліся каталікі ад уніяцкага святарства, гэта ўвядзення цэлібату.

Вялікую цікавасць выклікае апублікаваны ў «Гродненских епархиальных ведомостях» артыкул архімандрыта Микалая [1], у якім аўтар выступіў з крытыкай у адносінах шматлікіх сцвярджэнняў С. Паўловіча, у прыватнасці, адносна ордэна базіліян. Па-першае, ён абвергнуў магчымасць існавання так званай «униатско-православной» партыі і, па-другое, прывёў шмат фактаў у апраўданне базіліянаў, заснаваных на супярэчнасцях у даследаванні С. Паўловіча.

Гісторыі Замойскага сабора прысвечана і праца Г. Хрусцэвіча [4]. Даследаванне прысвечана такім пытанням, як увядзенне ўніі і фарміраванне базіліянскага ордэна, як галоўнага ўдзельніка Замойскага сабору, справакаваўшага прыняцце рашэнняў, неабходных каталіцкаму боку. Дзякуючы апецы езуітаў, базіліяне самі «изменили весьма многое в обрядах св. восточной церкви и в совершении божественной литургии, заменивши по одному лишь своему произволу многое греческое чисто латинским, и до того перепутали все, что нынешние обряды невозможно на-

звать ни греческими, ни латинскими» [4, с. 30]. Заняўшы першасныя пазіцыі ва ўніяцкай царкве, базіліяне імкнуліся кіраваць ёю, пакуль тая «окончательно сольется с церковью римской» [4, с. 92]. Адмоўнай рысай было і тое, што каталіцкі клір часта дапамагаў у царкоўных справах і службах уніяцкаму, што спрыяла акаталічванню прыхажан, асабліва падчас споведзі. Уніяцкія цэрквы «в Литовско-польском государстве, ко времени Замойскаго собора, значительно обветшали, обеднели, опустели и высматривали хуже еврейских синагог» [4, с. 171]. Народ стаў паглядаць у бок багатых і велічных каталіцкіх касцёлаў з пышнымі набажэнствамі, у якіх часта ўдзельнічаў іх святар-уніят, спадзеючыся што-небудзь зарабіць, дапамагаючы ксянзу [4, с. 172].

Акрамя «униатско-православной» і каталіцкай партый Г. Хрусцэвіч вылучаў яшчэ існаванне базіліянскай партыі, якая на саборы адстойвала свае ўласныя інтарэсы.

Трэцяя глава работы прысвечана разгледжанню стана праваслаўный царквы ў Рэчы Паспалітай напярэдадні Замойскага сабора. Пададзена поўная карціна таго, на што ішлі каталікі для дасягнення сваіх мэтаў па пераводзе праваслаўных спачатку ў ўнію, а затым і ў каталіцтва. Апісаны сродкі дзяржаўнага і заканадаўчага ціску на праваслаўных. Адной з галоўных задач для правядзення сабору ў каталікоў і базіліян, па меркаванню аўтара, «было желание устроить опять нечто вроде Люблинскаго съезда, с тем, однако, различием, что на нем имелось ввиду уже не объединение православных с униатами, а объединение униатской церкви с церковью латинской, приведение так сказать унии к последней ея цели» [4, с. 214].

Белае ўніяцкае святарства было на саборы нешматлікім і ў асноўным складалася са святароў буйных гарадскіх прыходаў, якія не разумелі патрэб сваіх субратоў з вёсак [4, с. 271]. Аднак, убачыўшы, у якім напрамку вядуцца абмеркаванні саборных пытанняў, усё белае святарства пакінула сабор, не падпісаўшыся пад яго рашэннямі [4, с. 272]. Аўтарскае меркаванне адносна карысці абрадных і дысцыплінарных пастаноў гучыць наступным чынам: «постановления обрядовыя, сделанныя на Замойском соборе, принеся ун. церкви некоторую долю пользы, принесли ей однако гораздо больше вреда» [4, с. 329]. Для праваслаўных надыйшоў перыяд новых праследаў, так як сабор прыняў рашэнне, што адзінай законнай царквой усходняга абраду ў краіне з'яўлялася ўніяцтва і неабходна было зрабіць уніятамі ўсіх праваслаўных, а таксама іх цэрквы і манастыры. Шляхта, католікі і ўніяты «нападали на православные церкви и дома православных священников, грабили их, заставляли самыми насильственными мерами принимать унию, прогоняли из подвластных им церквей православных священников, замещая их униатскими, налагали на православных тяжелые повинности, лишали их имений, духовенство и православную веру подвергали поруганиям» [4, с. 368].

Падводзячы вынікі гісторыі Замойскага сабору, Г. Хрусцэвіч прыйшоў да высновы, што дадзены сабор прынёс толькі шкоду ў жыццё ўніяцкай царквы, так як «сделалось обязательным все то, что было принято в виде тайных обязательств в Риме Ипатием Потеем и Кириллом Терлецким, все то, что было введено в духе той же церкви самим Замойским собором» [4, с. 389]. Але самым адмоўным вынікам было тое, што пастановы сабору «давали полнейшую свободу латинизаторской деятельности тех лиц из среды униатов, которыя усердно преобразовали униатскую церковь в духе церкви римской, истребляя последние остатки в ней православия» [4, с. 389].

Такім чынам, на старонках Літоўскіх і Гродзенскіх епархіяльных ведамасцей ёсць грунтоўныя даследчыцкія працы, якія разглядалі правядзенне лёсавызначальнага для ўніяцтва Замойскага сабора, яго перадумовы, прычыны і наступствы. Епархіяльныя ведамасці можна выкарыстоўваць як адну з гістарыяграфічных крыніц па гісторыі ўніяцтва і па гісторыі Замойскага сабору ў прыватнасці.

1. Николай, архимандрит Заметка на статью Опыт истории Замойскаго униатскаго провинциальнаго собора 1720 г. С. К. Павловича / архимандрит Николай // Гродненские епархиальные ведомости. – 1904. – № 11. – С. 310–319.

2. Павлович, С. К. Опыт истории Замойскаго униатскаго провинциальнаго собора (1720 г.) / С. К. Павлович // Гродненские епархиальные ведомости. – 1903. – № 26. – С. 284–288; № 27-28. – С. 300–303; № 29-30. – С. 311–314; № 31. – С. 322–324; № 32. – С. 329–332; № 34. – С. 351–355; № 36. – С. 371–376; № 37.

3. Стрельбицкий, И. Униатские церковные соборы с конца XVI в. до возсоединения униатов с православной церковью / И. Стрельбицкий // Литовские епархиальные ведомости. – 1888. – № 6. – С. 43–46; № 8. – С. 58–60; № 11. – С. 86–88; № 12. – С. 92–94; № 13. – С. 98–102; № 14. – С. 107–109; № 15. – С. 117–120; № 16. – С. 124–125; № 23. – С. 187–190; № 24. – С. 198–202; № 25. – С. 206–210; № 26-27. – С. 215–216; № 28. – С. 232–236; № 29. – С. 242–244; № 30. – С. 260; № 32. – С. 275–276; № 35. – С. 301–304; № 36. – С. 307–308; № 37. – С. 316–319; № 39. – С. 330–331; № 40. – С. 339–341.

4. Хрусцевич, Г. История Замойскаго собора (1720 года) / Г. Хрусцевич // Литовские епархиальные ведомости. – 1880. – № 3. – С. 18–21; № 4. – С. 27–30; № 5. – С. 34–39; № 8. – С. 62–65; № 11. – С. 91–95; № 13. – С. 106–110; № 14. – С. 117–120; № 19. – С. 157–160; № 20. – С. 163–165; № 21. – С. 171–173; № 25. – С. 202–206; № 26. – С. 211–215; № 30. – С. 249–251; № 31. – С. 259–265; № 32. – С. 270–276; № 33. – С. 283–285; № 37. – С. 317–318; № 38. – С. 326–332; № 40. – С. 342–344; № 41. – С. 352–355; № 43. – С. 368–373; № 44. – С. 378–380; № 45. – С. 388–390.



Репозиторий ВГУ